УДК 811.161.2 + 811.162.1

Г. У. Крофта, канд. філ. навук
(ГрДУ ім. Я. Купалы, г. Гродна)

# СЛОВАЎТВАРАЛЬНАЯ СЕМАНТЫКА АГЕНТЫЎНЫХ НАЙМЕННЯЎ АСОБЫ З АЦЭНАЧНЫМ ЗНАЧЭННЕМ У БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОВАХ

Дзеянне, пакладзенае ў аснову агентыўных асабовых найменняў з ацэначным значэннем, з'яўляецца тыповым, вызначальным для асобы. Асноўны спосаб дэрывацыі – суфіксацыя (пераважна ад дзеяслоўных асноў). Беларуская і польская мовы для ўтварэння ацэначных агентыўных найменняў асобы карыстаюцца рэестрам адметных словаўтваральных сродкаў.

У беларускай мове ў дадзенай падгрупе найбольш пашыраны назоўнікі з суфіксам *-нік*. Для абазначэння асобы паводле негатыўнай прыметы выкарыстоўваюцца дэрываты з суфіксам *-шчык*. Агентыўныя найменні з ацэначным значэннем утвараюцца таксама пры дапамозе суфіксаў *-ун*, *-к-а, -л-а, -уг-а, -аг-а*, радзей – *-ач, -ік, -ок, -ец* і інш.

У польскай мове рэгулярнасцю ў дадзенай падгрупе вызначаюцца суфіксы *-c-a, -arz, -us (-uś), -acz, -nik, -ciel.* Адмысловыя фарманты, што выкарыстоўваюцца для ўтварэння агентыўных найменняў асобы з ацэначным значэннем у польскай мове і адсутнічаюць у беларускай: *-us (pijus), -uś (pracuś, sługuś), -ek (śmieszek, skoczek), -uł-a (gaduła), -och (spioch), -ug-a (pleciuga), -uch (pleciuch, łasuch, leniuch), -alsk-i (-lsk-i) (gadulski, zapominalski).* У беларускай няма эквівалентаў да некаторых з гэтых назоўнікаў: *zapominalski – няпамятлівы чалавек, obrażalski – крыўдлівы чалавек*.

Значэнне некаторых беларускіх назоўнікаў таксама перадаецца апісальна: *прыдумшчык – pomysłowy człowiek, człowiek z pomysłami (pełen pomysłów)*.

Пры супастаўленні агентыўных назоўнікаў дзвюх моў не назіраецца супадзення словаўтваральных мадэлей: напрыклад, эквівалентамі беларускіх агентываў, утвораных ад дзеяслоўных асноў пры дапамозе суфікса *-нік*, у польскай мове выступаюць дэрываты з *-ciel,-acz, -c-a, -arz* і інш.; з суфіксам *-шчык – -acz, -c-a, -ciel і інш.; -ун – -uł-a, -ac, -c-a, -ak, -ek, -uch, -ing-a, -ski, -iec, -ent* і г.д.